Л. Р. Машчэнская ( Мінск)

## Структура і семантыка верша Яна Чыквіна “Паўночны пейзаж”

Верш Яна Чыквіна “Паўночны пейзаж”, які быў надрукаваны ў часопісе “Тэрмапілы” (Беласток, 2001), мае невялікі памер – 9 радкоў: Сонца ледзь кругліцца (1) Ідзем абы ісці (2) па неспадзеўных выкрутах дзён (3) у няведамай напрамнасці (4). Табе не матуліцца (5), мне – не татуліцца (6). З двух бакоў для нас (7) той самы гарызонт відзён (8), // падпёрты каменя ілбом (9).

Назва верша не зусім адпавядае яго сутнасці, таму што непасрэдная пейзажная замалёўка займае толькі чатыры радкі – першы і тры апошнія. Пейзаж максімальна абагульнены, яго абрысы ледзь выяўляюцца і цягнуць за сабой мноства асацыятыўных сувязей і суб’ектыўных тлумачэнняў. З пейзажных матываў у вершы прысутнічае *сонца*, якое *ледзь кругліцца*, *гарызонт*, *з двух бакоў*, *той самы, падпёрты каменя ілбом.* Ледзь круглае сонца можа ўспрымацца, як сонца, якое ледзь праглядаецца праз туман, дымку; гарызонт, падпёрты з двух бакоў каменнямі, магчыма, увасабляе гарадскі пейзаж, своеасаблівае каменнае рэчышча, у якім знаходзяцца лірычныя героі верша – ён і яна. Так узнікаюць ў вершы яшчэ два імпліцытныя пейзажныя матывы, матывы *тумана* і нейкай каменнай *цясніны.* Прырода ў вершы прыглушаная, амаль нежывая, бескаляровая: ў тэксце няма ніводнага слова, якое бы несла каляровую сему, а між тым колер сімвалізуе жыццё, прырода без колеру ўступае ў перыяд агоніі, у яе няма жыццяздольнага працягу.

Эмацыянальны стан прыроды супадае з настроем лірычных герояў верша. Для псіхалагічнага стану герояў не мае значэння час сутак і пара года, бо яны ідуць без мэты і без надзеі (*абы ісці*) *у няведамай напрамнасці па не-спадзеў–ных выкрутах дзён.* Драматычную сітуацыю герояў ўдакладняюць радкі *Табе не матуліцца, мне – не татуліцца*. Дзеясловы *матуліцца, татуліцца* набываюць значэнне сацыяльнага стану, таму што бацькоўская функцыя перш за ўсё грамадская. Безасабовыя сказы выяўляюць нейкую знешнюю, вонкавую сілу, не дазваляючую жанчыне стаць матулей, а мужчыне – татулям. Жыццё лірычных герояў (а ці не апошнія яны людзі на зямлі?) не мае працягу ў дзецях, не мае развіцця. Так у вершы выяўляецца спаянае адзінства прыроды і чалавека; абодва кампаненты сусвету не маюць перспектывы існавання.

У кампазіцыйным плане верш з’яўляецца семантычным колам: ён пачынаецца і завяршаецца пейзажнымі матывамі. Твор статычны,

беспадзейны, гэта верш-стан: у ім толькі адзін дзеяслоў руху, і гэты рух, па сутнасці, стан герояў (*ідзем абы ісці*), астатнія дзеясловы *круглiцца*, *матуліцца, татуліцца,* дзеяпрыметнікі *відзён*, *падпёрты* характарызуюць стан прыроды і чалавека, а між тым на фармальным, моўным узроўні і на семантычным верш паступова набывае вялікую эмацыянальную выразнасць, дынамічную напружанасць, якая развіваецца крэшчэнда і заканчваецца абрывам. Прыроднае і пачуццёвае у ім пераплятаецца ў нейкі непаўторны адухоўлены вобраз паміраючага сусвету. Дынамізм верша асноўваецца на інверсіях, сінтаксічным паралелізме, аўтарскіх словатворах, на вольнай структуры вершаваных радкоў: *па* ***неспадзеўных выкрутах*** *дзён у няведамай* ***напрамнасці; татуліцца; матуліцца****; З двух бакоў для нас той самы гарызонт* ***відзён****, падпёрты каменя ілбом.*

Верш беларускага паэта Беласточчыны Яна Чыквіна арганічна ўваходзіць ў адзіную, непадзельную беларускую літаратуру, ён характарызуецца многаслойнасцю і па сутнасці з'яўляецца палімсестам, у якім праслаіваюцца дэнататыўны пласт рэчаістнасці, пласт сімвалічны і міфалагічны, і ўсё гэта мае непасрэдны выхад у архетыпічны светапогляд беларусаў.

Беларускі менталітэт прасочваецца ў павольных кроках жыцця, трагічнага ў сваёй несуразнасці, у эсхаталагічных матывах (дабравольнае падпарадкаванне людзей вышэйшай волі; цьмянае сонца; бескаляровая прырода), у гарманічных суадносінах мужчынскага і жаночага пачатку: ён і яна ідуць разам па жыцці, яны аб'яднаны агульным псіхалагічным настроем (*ідзем; для нас; табе і мне; не матуліцца; не татуліцца*). Да старажытнага светаўспрымання адносіцца антрапаморфны падыход да прыроды, які рэалізуецца антрапаморфнымі метафарамі і метаніміяй (*неспадзеўныя выкруты дзён*; *каменя ілбом; у няведамай напрамнасці*). Сімвалічнае значэнне праследжваецца амаль у кожным слове верша: *паўночны* – паўночны і эмацыянальны, псіхалагічны холад; *сонца* – касмічны аб'ект і сімвал света, жыцця; выкруты *дзён* – дні і час наогул; *ісці* – рухацца і ісці жыццёвай пуцявінай; *напрамнасць* – напрамак і жыццёвая мэта. Тое ж можна сказаць і пра міфалагічную насычанасць верша: *мужчынскі – жаночы*, *вертыкальная лінія* (*гарызонт, падпёрты каменя ілбом*) – *гарызантальная лінія* (*на–прамнасць*); *круг* (*круглiцца, выкруты*).

Імпрэсіяністычны шматмерны верш Яна Чыквіна не магчыма раскрыць вербальна, яго можна толькі прачуць, і нам здаецца, што гэты таленавіты твор неаднойчы будзе прыцягваць да сябе ўвагу даследчыкаў.

Ад назвы да мастацкага зместу: ЗБОРНИК ВЕРШАУ ЯНА ЧЫКВИНА «ЖМЕНЯ ПЯСКУ» (Беласток 2008)

Назва мастацкага твора кожнага жанру – самая актуальная яго прымета. Гэты славесны комплекс, значэнне якога имплицытна практуецца на змест усих тэкставых узроуняу и яго частак, на яго агульную, скразную идэю. Назва з:яуляецца зыходнай эстэтычнай наминацыяй, без якой литаратурны твор губляе сваю самастойнасцьен зауседы займае моцную пазицыю, якая уздейничае на усе асноуныятэкставыя катэгорыи – мадальнасць, кагезию, працягласць, структуру, канцэптуальнасць и г.д. (Кухаренко А.В., С. 38, 53). У той жа час загаловак – аутаномная, цэласная самадастатковая адзинкп литиратурнага твора, якая можа функцыянаваць у мауленни адрозна ад тэкста, але тольки сярод твых, хто ведае змест тэкста. Назва з:яуляецца першым словам аутара, звернутым да чытача (Рогалев А.Ф., с. 26, 111).

Мэта назвы як першага элемента твора – прыцягнуць увагу чытача, наладзиць кантакт з им, накироуваць яго чаканне. Поуны змест фармируецца паступова и можа быць усвядомлены тольки пасля прачытання тэкста.

Па сваей граматычнай структуры назва апошняга зборника Яна Чыквина «Жменя пяску» належыць генитыунага словазлучэння назоуникауз аб*ектным значэннем, сэнс якога складаецца з савакупнасци наминатыуных значэнняу лексем жменя и пясок жменя –«гэта и да